# § 15. Правы чалавека і грамадзяніна ў Рэспубліцы Беларусь

## Мы ўсе розныя — мы ўсе роўныя?



**10 снежня — Дзень правоў чалавека**

**Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах**
1966 г.

**1948 г.**
**Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека**

**Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах**
1966 г.

**Канвенцыі**

- Супраць катаванняў
- Аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі
- Аб правах дзіцяці
- Аб правах людзей з інваліднасцю
- Аб ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь**
Чалавек, яго правы і свабоды з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы

| Прынцыпы | Віды правоў |
| --- | --- |
| Усеагульнасць і неад'емнасць | Асабістыя |
| Узаемасувязь і непадзельнасць | Палітычныя |
| Роўнасць і недыскрымінацыя | Эканамічныя |
| Удзел і ўключэнне ўсіх | Сацыяльныя |
| Адказнасць дзяржавы за забеспячэнне правоў | Культурныя |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце, прынцыпы і пакаленні правоў чалавека.** Чаму Дзень правоў чалавека адзначаецца 10 снежня? Таму што менавіта ў гэты дзень у 1948 г. Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) прыняла Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека. Значэнне гэтага міжнароднага дакумента ў тым, што ў ім былі абвешчаны **правы чалавека** — неад'емныя, уласцівыя кожнаму чалавеку ад нараджэння, незалежна ад яго расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, этнічнага паходжання, маёмаснага або іншага становішча.

Вельмі важнае значэнне маюць міжнародныя дакументы і пагадненні аб правах чалавека, якія абавязаны выконваць усе дзяржавы, што далучыліся да іх. Найважнейшымі характарыстыкамі правоў чалавека з'яўляюцца ўніверсальнасць, неад'емнасць, непадзельнасць, узаемазвязанасць і ўзаемазалежнасць.

## Прынцыпы правоў чалавека

| | |
|---|---|
| **Правы чалавека ўніверсальныя** | Кожны мае права карыстацца правамі чалавека, без усялякіх адрозненняў з-за расавай або этнічнай прыналежнасці, колеру скуры, полу, інваліднасці, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, нараджэння, маёмаснага або іншага становішча |
| **Правы чалавека неад'емныя** | Правы чалавека нельга страціць, паколькі яны маюць дачыненне да самога факта чалавечага існавання, яны ўласцівыя ўсім людзям, маюць натуральны характар |
| **Правы чалавека непадзельныя, узаемазалежныя і ўзаемазвязаныя** | Розныя правы чалавека па сутнасці звязаны паміж сабой і не могуць разглядацца паасобку. Ажыццяўленне аднаго права залежыць ад ажыццяўлення многіх іншых правоў, і няма ніводнага права, якое было б важнейшым за астатнія |

Дзеянне якога прынцыпу правоў чалавека абмяжоўваецца ці прыпыняецца ў выпадку, калі нехта прызнаны вінаватым у здзяйсненні злачынства і пазбаўлены волі ў адпаведнасці з прыгаворам суда? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паняцце «правы чалавека» змяняецца з часам. Невыпадкова аўтары Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека адмовіліся вызначыць нейкі адзіны пералік правоў, прызнаючы магчымасць з'яўлення новых правоў чалавека. Сёння вылучаюцца «тры пакаленні» правоў чалавека як этапы, звязаныя з часам прызнання правоў чалавека грамадствам і ўключэннем іх у канстытуцыі розных дзяржаў. «Першае пакаленне» (правы свабоды) — грамадзянскія і палітычныя правы, «другое пакаленне» (правы роўнасці) — сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы, «трэцяе пакаленне» — калектыўныя правы (правы салідарнасці).

**Міжнародныя стандарты па абароне правоў чалавека.** Чаму ўключэння нормаў па правах чалавека ў канстытуцыі асобных дзяржаў было недастаткова і ўзнікла неабходнасць у міжнародных пагадненнях?

Прыгадайце з курса гісторыі, што такое генацыд.



Найбуйнейшым на тэрыторыі Беларусі месцам масавага знішчэння людзей у гады акупацыі падчас Другой сусветнай вайны з'яўляўся лагер смерці «Трасцянец». Па колькасці ахвяр ён займае 4-е месца пасля такіх сумна вядомых канцэнтрацыйных лагераў у Еўропе, як Асвенцім, Майданак і Трэблінка.

Як вы думаеце, чаму галоўны помнік у мемарыяльным комплексе «Трасцянец» называецца «Брама памяці»?

Пасля Другой сусветнай вайны ў ходзе стварэння Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і суда над нацысцкімі злачынцамі ў Нюрнбергу члены міжнароднай супольнасці далі ўрачыстае абяцанне не дапускаць надалей здзяйснення злачынстваў супраць чалавечнасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека была прынята ў якасці ўзору правілаў, якіх абавязаны прытрымлівацца ўсе народы і краіны.

**Дэкларацыя правоў чалавека — усеагульны ўзор магчымасцей?**




Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека складаецца з 30 артыкулаў і з'яўляецца асноватворным дакументам гістарычнай значнасці. У ёй, упершыню ў гісторыі чалавецтва, былі вызначаны асноўныя правы чалавека, якія неабходна абараняць на міжнародным узроўні. З моманту свайго прыняцця ў 1948 г. Дэкларацыя была перакладзена на больш чым 500 моў і паслужыла арыенцірам для канстытуцый многіх дзяржаў.

Дакажыце прыкладамі з тэксту дакументаў, што ідэі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека знайшлі адлюстраванне ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. ■

Аднак аднаго абвяшчэння правоў недастаткова, каб яны сталі абавязковымі для выканання, правы павінны быць замацаваны міжнароднымі дагаворамі. Таму ў 1966 г. Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый былі таксама прыняты два пакты ў галіне правоў чалавека: Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах. Разам з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека гэтыя дакументы ўтвараюць Міжнародны біль аб правах чалавека.

Таксама быў прыняты цэлы шэраг міжнародных дакументаў — *канвенцый* для ліквідацыі дыскрымінацыі і абароны правоў канкрэтных груп насельніцтва: аб ліквідацыі расавай дыскрымінацыі, аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын, супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання, аб правах дзіцяці, аб правах людзей з інваліднасцю і інш. Канвенцыі носяць абавязковы характар для дзяржаў, якія іх падпісалі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Важнае значэнне ў сферы выканання правоў чалавека маюць дагаворныя органы ААН. Гэта камітэты незалежных экспертаў, якія назіраюць за выкананнем асноўных міжнародных дагавораў у галіне правоў чалавека.

Сучасны лагатып правоў чалавека спалучае ў сабе сілуэты рукі і птушкі, што сімвалізуе мірны ўклад ва ўмацаванне правоў чалавека, нягледзячы на культурныя і моўныя бар'еры.

Знайдзіце плакаты, прысвечаныя Дню правоў чалавека. Якія сімвалы на іх сустракаюцца часцей за ўсё? ■

Стварыце свой плакат, прысвечаны правам чалавека. ■

У галіне правоў чалавека Беларусь супрацоўнічае і з іншымі арганізацыямі, у прыватнасці з Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ).

**Правы і абавязкі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.** Рэспубліка Беларусь забяспечвае адпаведнасць свайго заканадаўства асноўным палажэнням міжнародных дакументаў аб правах чалавека. Раздзел II Канстытуцыі «Асоба, грамадства, дзяржава» прысвечаны правам і свабодам чалавека і грамадзяніна, а таксама абавязкам грамадзян перад дзяржавай і дзяржавы перад грамадзянамі. Як адзначаецца ў артыкуле 2, чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы. Дзяржава адказная перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы. Грамадзянін адказны перад дзяржавай за няўхільнае выкананне абавязкаў, якія ўскладзены на яго Канстытуцыяй.

Правы чалавека грунтуюцца на роўнасці ўсіх людзей перад законам, з'яўляюцца неад'емнымі і гарантаваны кожнаму, хто знаходзіцца ў сферы дзеяння беларускага заканадаўства. Пры гэтым ажыццяўленне правоў і свабод аднаго чалавека не павінна парушаць правы і свабоды іншых людзей. У асабліва складаных



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сітуацыях дзяржава можа на пэўны час абмежаваць правы чалавека. Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гэта магчыма ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб.

Разгледзім найважнейшыя правы, зафіксаваныя ў Канстытуцыі.

## Асабістыя правы

- **Права на жыццё**
- **Права на свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы**
- **Права на тайну асабістага жыцця**
- **Права на недатыкальнасць жылля**
- **Права на свабоду перамяшчэння і выбар месца жыхарства**
- **Права на самастойнае вызначэнне адносін да рэлігіі**
- **Права на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям'і**
- **Права захоўваць нацыянальную прыналежнасць і выбіраць мову зносін**
- **Права на судовую абарону**
- **Права на юрыдычную дапамогу**

У артыкуле 24 Канстытуцыі зафіксавана, што кожны чалавек мае права на жыццё. Дзяржава абараняе жыццё чалавека ад любых супрацьпраўных замахаў. З правам на жыццё цесна звязана праблема смяротнай кары, якая сёння існуе ў розных краінах (ЗША, Кітай, Індыя і інш.). Заканадаўства Рэспублікі Беларусь дапускае ўжыванне смяротнай кары як выключнай меры пакарання за асабліва цяжкія злачынствы і толькі згодна з прыгаворам суда. Пытанне пра адмену смяротнай кары ў нашай краіне абмяркоўвалася на рэспубліканскім рэферэндуме ў 1996 г. Супраць адмены смяротнай кары ў нашай краіне выказаліся 80,44 % грамадзян, якія ўдзельнічалі ў галасаванні.

Дзяржава забяспечвае *свабоду*, *недатыкальнасць* і *годнасць асобы*. Абмежаванне або пазбаўленне асабістай свабоды дапускаецца ў выпадках і ў парадку, прадугледжаных законам. *Права*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*на тайну асабістага жыцця* замацоўвае права кожнага на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў.

*Палітычныя правы.* У адрозненне ад асабістых правоў многія палітычныя правы і свабоды належаць толькі грамадзянам Рэспублікі Беларусь.

## Палітычныя правы

### Кожны мае права

- **На свабоду поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне (свабода слова і свабода друку)**
- **На свабоду сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання**
- **На свабоду аб'яднанняў**
- **Накіроўваць звароты ў дзяржаўныя органы**

### Грамадзянін мае права

- **Удзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных спраў**
- **Выбіраць і быць выбраным у дзяржаўныя органы**
- **На роўны доступ да любых пасад у дзяржаўных органах**
- **На атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя**

Абмяркуйце і аргументуйце, чаму многія палітычныя правы належаць толькі грамадзянам беларускай дзяржавы? ■

*Сацыяльныя і эканамічныя правы* ахопліваюць сферу працы, занятасці, дабрабыту людзей. Так, кожны чалавек мае права на *годны ўзровень жыцця*, уключаючы дастатковае харчаванне, адзенне, жыллё і пастаяннае паляпшэнне неабходных для гэтага ўмоў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Сацыяльныя і эканамічныя правы

- **Права на годны ўзровень жыцця**
- **Права на працу (выбар прафесіі, роду заняткаў і работы)**
- **Права на абарону эканамічных і сацыяльных інтарэсаў (уключаючы права на аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, права на забастоўку)**
- **Права на справядлівую долю ўзнагароджання за працу**
- **Права на адпачынак**
- **Права ўласнасці**
- **Права на жыллё**
- **Права на ахову здароўя**
- **Права на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці, страты карміцеля і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам**

*Культурныя правы* забяспечваюць духоўнае развіццё чалавека. Агульная сярэдняя і прафесійна-тэхнічная адукацыя ў нашай краіне даступная і бясплатная для ўсіх, а сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя даступная ў адпаведнасці са здольнасцямі кожнага і бясплатная пры ўмове праходжання па конкурсе ў абраную ўстанову адукацыі. Права на ўдзел у культурным жыцці забяспечваецца агульнадаступнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія знаходзяцца ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, развіццём сеткі культурна-асветных устаноў.

## Культурныя правы

- **Права на адукацыю**
- **Права на ўдзел у культурным жыцці**
- **Свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання**

Таксама Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь замацавана *права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе* і на пакрыццё шкоды, прычыненай парушэннем гэтага права. У розных даследаваннях яно разглядаецца альбо як асабістае права кожнага чалавека, альбо як сацыяльнае права. У цяперашні час дадзенае права з'яўляецца асноватворным сярод *экалагічных правоў* чалавека.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Наяўнасць правоў і свабод прадугледжвае таксама абавязкі і адказнасць чалавека перад грамадствам і дзяржавай. Дзяржава, у якой ва ўсіх будуць толькі правы, але не будзе абавязкаў, не зможа доўга існаваць. Разгледзім, напрыклад, абавязак плаціць падаткі. Калі падаткі не будуць выплачвацца, дзяржава не зможа забяспечыць грамадзянам у выпадку хваробы медыцынскую дапамогу, будзе вымушана закрыць школы.

## Канстытуцыйныя абавязкі

**Кожны, хто знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, абавязаны:**

- **выконваць Канстытуцыю, законы і паважаць нацыянальныя традыцыі;**
- **паважаць годнасць, правы, свабоды, законныя інтарэсы іншых асоб;**
- **берагчы гістарычна-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці;**
- **ахоўваць прыроднае асяроддзе**

**Грамадзяне Рэспублікі Беларусь абавязаны:**

- **прымаць удзел у фінансаванні дзяржаўных расходаў шляхам выплаты дзяржаўных падаткаў, пошлін і іншых плацяжоў;**
- **абараняць Рэспубліку Беларусь**

У сваю чаргу дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры дзеля стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

?

1. Правы чалавека — гэта правілы, што забяспечваюць абарону годнасці і свабоды кожнага асобнага чалавека?
2. Вызначце, які прынцып правоў чалавека ілюструюць словы: «Ідэал свабоднай чалавечай асобы, свабоднай ад страху і нястачы, можа быць ажыццёўлены, толькі калі будуць створаны такія ўмовы, пры якіх кожны можа карыстацца сваімі эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі правамі гэтак, як і сваімі грамадзянскімі і палітычнымі правамі» (Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, 1966).
3. У чым падабенства і адрозненні паміж:
   - правамі чалавека і правамі грамадзяніна?
   - дэкларацыяй і канвенцыяй?
4. Дапоўніце табліцу «Пакаленні правоў чалавека» канкрэтнымі прыкладамі правоў чалавека. Выкарыстоўваючы веды з гісторыі, растлумачце, чаму яны сфарміраваліся менавіта ў гэты час.

| Першае пакаленне | Другое пакаленне | Трэцяе пакаленне |
|---|---|---|
| **з канца XVIII ст. да пачатку XX ст.** | **з другой паловы XIX ст. да сярэдзіны XX ст.** | **другая палова XX ст.** |
| **грамадзянскія (асабістыя) і палітычныя** | **сацыяльныя, эканамічныя і культурныя** | **калектыўныя правы** |
| | | |

5. Растлумачце, чаму выкананне грамадзянамі сваіх абавязкаў — гэта найважнейшая ўмова рэалізацыі іх правоў.

Правядзіце міні-даследаванне «Правы чалавека пасля Нюрнберга». Дзейнасць Міжнароднага ваеннага трыбунала нярэдка называюць «Нюрнбергскім эпілогам». Якія ваенныя злачынствы асудзілі на працэсе ў Нюрнбергу (20 лістапада 1945 — 1 кастрычніка 1946 гг.)? Запоўніце табліцу: суаднясіце правы і іх парушэнні, якія мелі месца ў гады Другой сусветнай вайны.

| Правы чалавека | Парушэнні |
|---|---|
| | |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне